падумаць і аб мадэлях выпускаў. Вельмі перспектыўным бачыцца штотыднёвік з бязмежна шырокай тэматыкай: дзелавое жыццё, палітыка, эканоміка, забавы, адпачынак, сямейнае чытанне, прыкладная рэклама. Такое выданне выконвае ролю не толькі інфарматара, але і памочніка, субяседніка, дарадчыка, псіхолага і г.д.Не выключана і штодзённая шоў-газета, якая працуе ярка, дынамічна, свабодна. Абласныя ж газеты са зменнымі палосамі для раёнаў – пад сумненнем. Рэальнае права на існаванне, без сумнення, маюць міжабласныя і міжраённыя ("куставыя") газеты, якія абслугоўваюць усе суб'екты рынка. Што датычыцца "шматтыражак", то яны, па-першае, наўрад ці захаваюцца – хіба як прыналежнасць фірм і ўстаноў, а па-другое, іх. відавочна, трэба перайменаваць, бо яны ўжо не адказваюць сваёй ранейшай назве: выходзяць невялікімі тыражамі.

Магчымыя і другія варыянты. Ёсць над чым папрацаваць Дзяржкамітэту па друку і ўсім іншым зацікаўленым органам улады! Ды гэтая тэма прадстаўляе сабой і асаблівую навуковую значнасць.

*Т.У. ПАДАЛЯК*

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ АСВЯТЛЕННЯ САЦЫЯЛЬНА-МАРАЛЬНЫХ ПЫТАННЯЎ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ 90-х г. XX ст.

Ва ўмовах генерацыі новых палітыка-эканамічных гіпотэз, мадыфікацыі сацыяльна-культурных праграм, калі радыкальна пераасэнсоўваюцца традыцыйныя каштоўнасці і чалавек трапляе ў сітуацыю кардынальнага светапогляднага выбару, сродкі масавай інфармацыі (СМІ) правамерна разглядаць не толькі як механізм рэалізацыі асноўнай – інфарматыўнай – функцыі, але адначасова і як сродак духоўна-маральнага рэгулявання грамадства, дзейсны інструмент сацыялізацыі асобы. У гэтым аспекце дзейнасць прэсы можа быць эфектыўнай і адчувальнай толькі пры ўмове забеспячэння аўдыторыі аб'ектыўнай, праўдзівай, поўнай інфармацыяй – каб з дапамогай сумленнага, свабоднага публіцыстычнага слова чытачы маглі фарміраваць уласнае ўяўленне аб рэчаіснасці і магчымых перспектывах развіцця грамадства.

З сярэдзіны 80-х г. прэса выйшла на новы ўзровень распрацоўкі надзённых праблем рэчаіснасці, глыбокае публіцыстычнае асэнсаванне атрымалі разнастайныя пласты сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, духоўнага жыцця грамадства. Аднак у пачатку 90-х г. на фоне прагрэсіўных тэндэнцый павышэння аператыўнасці і пашырэння інфармацыйнасці набіраюць моц крайнасці і перахлёсты. Узнікае праблема "шокавай журналісцкай тэрапіі": ледзь не ў кожным газетным нумары – звяржэнні былых куміраў, смакаванне ўсяго раней забароненага.

З ускладненнем эканамічнай, палітычнай, сацыяльна-маральнай сітуацыі на Беларусі ўсё большую актуальнасць набывае праблема адэкватнасці прадмета адлюстравання (рэчаіснасці) у журналісцкім творы. Пры больш уважлівым і пільным вывучэнні журналісцкага працэсу можна прыйсці да высновы, што ў апошнія гады ўсё больш акрэслена прасочваецца тэндэнцыя адыходу публіцыстычнай думкі ад "злобы дня", ад аналізу нестабільнага стану грамадства, ад глыбокага сутнаснага погляду на прычыны, што вядуць да негатыўных вынікаў: ад эканамічнага банкруцтва грамадства да духоўнай дэградацыі асобы і грамадства.

Танальнасць публікацый многіх органаў інфармацыі ўсё больш збіваецца на танную сенсацыйнасць. Не выпадкова нават у вядучых рэспубліканскіх выданняў падае не толькі тыраж, але і ўзровень папулярнасці, рэйтынг. Можна пагадзіцца з даследчыкам А. Чычаноўскім: чытачы сапраўды "згаладаліся не толькі па праўдзівай, але і па "раскаванай" інфармацыі"[1], аднак сенсацыйнасць дзеля шоку, работа выключна на патрэбу дня, па прынцыпу



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

"чаго пажадаеце?" ніколі не былі перспектыўнымі для прэсы, бо ператваралі яе ў служку абываццеля.

Сенсацыя (ад лац "пачуццё, адчуванне") – моцнае ўражанне ад якой-небудзь падзеі; паведамленне, што выклікае ўсеагульную цікавасць, узбуджэнне. Арыентацыя на сенсацыйнасць стала няпісаным правілам не толькі для малатыражных недзяржаўных газет забаўляльнага накірунку, але і для рэспектабельных цэнтральных выданняў краіны. Рубрыкі "Сенсацыя", "Скандал" – частыя госці на старонках "Народнай газеты", "Советской Белоруссии", "Звязды". Аднак ці няма "згушчэння фарбаў", а значыць, наколькі аб'ектыўна адлюстроўваецца той ці іншы факт рэчаіснасці ў сродках масавай інфармацыі? Даследчык С. Рошчын справядліва адзначае, што "паміж сенсацыйнасцю і эмацыянальнасцю сувязь вельмі блізкая. Любое важнае паведамленне, нарыс, артыкул, якія закранаюць інтарэсы грамадства і людзей, павінны мець пэўную эмацыянальную афарбоўку, г. зн. элемент здаровай, нармальнай сенсацыйнасці. Пытанне толькі ў тым, каб сапраўднае пачуццё не падмянялася падробкай"[2]. Як сведчыць газетная практыка, некаторыя журналісты ўзялі на ўзбраенне немудрагелісты бульварны прынцып: сапраўдны ас журналістыкі не толькі шукае сенсацыю, але і стварае яе. Яркі прыклад – інфармацыя газеты "Вечерний Брест" пра быццам бы знойдзены скарб Напалеона. У канцы снежня 1994 г. агенцтва РІД, не абцяжарваючы сябе праверкай фактаў, распаўсюдзіла гэтую "навіну" па рэспубліканскіх выданнях. Але ўжо 10–12 студзеня 1995 г. беларускія газеты апублікавалі заметку карэспандэнта агенцтва "Белінфарм" І. Куксы пра механізм стварэння недакладнай інфармацыі «"Скарб Напалеона, "знойдзены" "Вечерним Брестом"». Адметна, што скарб Напалеона – адна з шануемых тэм журналістаў, падкіх на сенсацыю: у сярэдзіне 1997 г. у друку зноў папаўзлі чуткі пра знойдзены скарб[3].

Адышла хваля гучных выкрыванняў, зрывання "ўсіх і ўсялякіх масак", аўтаматычнага, часта бяздумнага змянення "плюсаў" на "мінусы"; спала пена шокавай тэрапіі некалі забароненых тэм, – неабходна пераходзіць ад развянчання мінулага да асэнсавання сучаснасці, узважанага аналізу новых фетышаў і лозунгаў. Аднак гэта адбываецца далека не заўсёды, журналістыка зноў ідзе па шляху найменшага супраціўлення – захоўваючы па інерцыі нецярпімасць да іншадумства, гранічную катэгарычнасць меркаванняў. Адметна, што пад выглядам крытыкі сучаснага грамадства адбываецца дэвальвацыя агульначалавечых каштоўнасцей: прэса не столькі адлюстроўвае, колькі прапагандуе ідэалы кшталту "ўсё дазволена". Штодзённая журналісцкая мітуслівасць паступова выцясняе са свядомасці чытача адчуванне трагічнасці таго, што адбываецца навокал.

З'явілася новая кан'юнктура, пад якую з гатоўнасцю падладжваюцца некаторыя журналісты і перыядычныя выданні. Шмат увагі СМІ ўдзяляюць станаўленню рыначных структур, развіццю бізнесу, прадпрымальніцтва, прычым "рыначныя" заклікі гучаць гэтак жа надакучліва, як некалі раней – камуністычныя. Мы мяркуем, што публікацыі ў пераважнай большасці характарызуюцца ўра-інтанацыяй: насаджэнне культу грошай, нажывы, узмацненне сацыяльнай дыферэнцыяцыі грамадства, рост адчужэння паміж людзьмі не выклікае насцярожанасці журналістаў, якія спецыялізуюцца па гэтых пытаннях. Хаця статыстыка сведчыць: толькі за 1995 г. беспрацоўе ў краіне вырасла на 35 працэнтаў, сярэдні ўзрост беспрацоўнага – 32 гады. "Адзначаецца павелічэнне колькасці беспрацоўных мужчын, моладзі да 25 гадоў і асоб ва ўзросце 41–50 гадоў", – інфармуе газета "Знамя юности" 9 лютага 1996 г. Вось нагода не толькі для роздуму, але і для публіцыстычнага доследу: якія шукаюцца шляхі, каб прадаставіць чалавеку магчымасць зарабіць на кавалак хлеба, не штурхаць яго на сцежку злачыннасці. Аднак самае большае, што прадпрымаюць журналісты, – гутараць з "адказнымі" асобамі, якія з аптымізмам расказваюць "аб зробленым" і дзеляцца планамі на будучае. Затое натхнёна і ахвотна распавядаюць карэспандэнты аб дзейнасці банкаў, прыватных фірмаў і прадпрыемстваў – складаецца



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

ўражанне, што Беларусь ператварылася ў філіял Швейцарыі. Захаплялья нарысы прысвячаюцца прадпрымальнікам і бізнесменам, гэтыя "героі часу" малююцца самымі сакавітымі фарбамі. У сувязі з гэтым дарэчы будзе ўзгадаць меркаванне акадэміка М. Амосава, выказанае ў "Литературной газете" 7 лістапада 1990 г.: "Надзея чалавецтва – эканамічны прагрэс. Размовы аб прымаце "духоўнасці" над "матэрыялізмам", "спажывецтвам" – нерэальныя. Канешне, чалавек скупы і эгаістычны, але калі ён сыты, дастаткова адукаваны, мае цікавую работу, то не будзе глухім да пакутаў бліжніх і будучага планеты". На нашу думку, меркаванне спрэчнае: "скупы і эгаістычны" чалавек наўрад ці стане дбаць пра будучыню планеты. А прадпрымальнасць, заснаваная на грэбаванні маральнасцю, прынясе нашаму грамадству, нашаму народу яшчэ больш страшныя бедствы, чым зведаныя дагэтуль. Вельмі бянтэжыць пасыл: спачатку разбагацеем, а потым будзем маралістамі і альтруістамі. Калі ўсё прадаецца і няма нічога святога, у небяспецы не можа адчуваць сябе ніхто.

На фоне вялікіх газетных матэрыялаў пра багатых, удачлівых "новых беларусаў" амаль непрыкметнымі застаюцца маленькія заметкі аб небяспецы, што цягне за сабой эканамічны хаос і рыначнае бязмежжа ў краіне. У рэспубліцы з кожным годам расце колькасць самазабойстваў. Як паказваюць пракурорскія праверкі, асноўныя прычыны трагедый такія: канфлікт з блізкімі, цяжкае матэрыяльнае становішча, беспрацоўе, немагчымасць аддаць даўгі. У матэрыяле "Над безданню. Устрымайцеся ад дарэмнага. Самазабойства як сродак пратэсту няма каму пачуць", змешчаным у "Народнай газеце" 30 студзеня 1996 г., журналіст В. Сарычаў адзначае: "Сіндром суіцыду на рабочым месцы працягвае трагічнае шэсце па рэспубліцы. Яшчэ свежыя ў памяці гомельскі і брэсцкі выпадкі, калі рабочыя накладвалі на сябе рукі ў цаху. І вось вестка аб новай бядзе, што здарылася на невялікім электрамеханічным заводзе ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна". Майстар ліцейнага ўчастка на вачах у людзей abліў сябе з бутэлькі бензінам і запаліў запалку. Матыў: сям'я, дзеці, а зарплата не выплачваецца некалькі месяцаў, няма на што купіць кавалак хлеба.

"Дыскамфорт, жыццёвая неўладкаванасць, разрыў прывычных чалавечых сувязей, адчуванне адзіноты – усё гэта ўздзейнічае на псіхіку чалавека прыгнятальна... Людзі, якія прывыклі жыць у актыўным сацыяльным акружэнні, у атмасферы адноснай матэрыяльнай абароненасці з боку дзяржавы, не заўсёды могуць прыстасавацца да новага ўкладу жыцця", – піша Г. Закржэўскі ў артыкуле "Змучаныя жыццём ці зачараваныя смерцю", апублікаваным у газеце "Советская Белоруссия" 19 снежня 1996 г. Дарэчы будзе ўзгадаць, што ў пачатку 90-х г., на моднай тады хвалі выкрыванняў мінулага, журналістка і пісьменніца Святлана Алексіевіч выдала кнігу "Зачараваныя смерцю" з падзагалоўкам "Расповеды рускіх самазабойцаў" – тым самым пісьменніца быццам бы зрабіла прысуд "сацыялістычнай імперыі". У інтэрв'ю газеце "Чырвоная змена" С. Алексіевіч прызнаецца: "Той жанр, у якім я працую, патрабуе, каб супадалі мае патрэбы і нейкія болевыя кропкі ... Мяне цікавіць, хто ставіць знак роўнасці паміж ідэяй і жыццём чалавека?"". Неверагодны ўсплеск самазабойстваў у грамадстве не цікавіць большасць публіцыстаў.

Папулярная ў 70-х – пачатку 80-х г. рубрыка "На тэмы маралі" бясследна знікла са старонак газет, яе замянілі рубрыкі "Крымінал", "Здарэнні", "Злачынствы". Факты насілля, жорсткасці, падману, разбэшчанасці, забойстваў часам падносяцца як дапушчальныя, дазволеныя з'явы рэчаіснасці. У выніку прэса міжволі прапагандуе самыя нізкія інстынкты.

Ствараецца ўражанне, што некаторыя выданні наўмысна вышукваюць пікантныя факты, каб менавіта іх зрабіць "цвіком" газетнага нумара. Напрыклад, у газеце "Советская Белоруссия" за 17 красавіка 1996 г. ў традыцыйным інфармацыйным блоку "Тэрмінова ў нумар" на першай паласе змешчаны заметкі пад наступнымі загалоўкамі: "Убив жену, бывший муж пытался покончить жизнь самоубийством", «"Похищено большое количест-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

во "мягкого золота"», "Детская шалость закончилась трагедией", "Уворованы иконы XIV в.", "Почему погиб несовершеннолетний?" Мяркую, што падобны падбор аператыўнай першапалоснай інфармацыі быў бы апраўданым, калі б "Советская Белоруссия" з'яўлялася органам Міністэрства ўнутраных спраў. Аднак заснавальнік выдання – Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, таму стратэгія і тактыка газеты са шматтысячным тыражом выклікае, па меншай меры, здзіўленне: няўжо аператыўная зводка прэс-службы МУС па злачынствах адлюстроўвае галоўнае, што адбываецца ў рэспубліцы? (Прынамсі, амаль увесь "боекамплект" згаданай першапалоснай інфармацыі "Советской Белоруссии" быў змешчаны ў "Народнай газеце" 26 красавіка 1996 г. у рубрыцы "Крымінальная хроніка" на 7-й старонцы выдання.) Варта падкрэсліць, што крымінальна-афарбаваная першапалосная інфармацыя ў "Советской Белоруссии" стала традыцыяй: 30 красавіка 1996 г. змешчаны наступныя паведамленні: "Нападение на колхозного сторожа", "Железная дорога не терпит халатности", "Таинственное исчезновение бывшего директора ЦРУ", "У страха глаза велики". Будзённае жыццё ў рэспубліцы не вычэрпваецца і тым больш не вызначаецца злачыннымі фактамі, таму ў якасці каментарыя можна ўзгадаць старую аксіёму: кожны бачыць тое, што хоча ўбачыць.

Камерцыялізацыя прэсы цягне за сабой праблему дакладнасці журналісцкай інфармацыі. У 90-я гады, акрамя дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва БЕЛТА ("Белінфарм"), актыўна дзейнічаюць недзяржаўныя агенцтвы "БелаПАН" (Беларускае прыватнае агенцтва навінаў) і "РіД" (Рэклама. Інфармацыя. Дайджэст). Заваяваўшы неблагую рэпутацыю ў пачатковы перыяд дзейнасці, з цягам часу агенцтвы ў барацьбе за "рынак збыту" інфармацыі ўсё часцей звяртаюцца да немудрагелістай лепкі "сенсацыйных" навінаў: праўдападобнасць плюс прыгожая "абгортка". Не злічыць фактаў, калі салідныя рэспубліканскія выданні вымушаны былі тлумачыць чытачу, адкуль вылецела "качка". Напрыклад, у нумары за 26 лістапада 1993 г. ўплывовая рэспубліканская газета "Звязда" двойчы, на першай і трэцяй старонках, давала тлумачэнні з нагоды РІДаўскіх "навінаў", змешчаных у газеце 20 і 24 лістапада. Журналісты "Звязды" публічна звярнуліся да калег: "... у апошні час на інфармацыю агенцтва РІД прыходзіць шмат рэкламацый. Таму просім: паважаныя калегі, будзьце ўважлівымі і дакладнымі, мы ўжо стаміліся даваць абвяржэнні на вашу інфармацыю".

У пошуках найбольш эфектыўных (і эфектных) сродкаў прыцягнення ўвагі чытача журналісты не грэбуюць самымі "нестэрыльнымі" (смакаванне інтымных падрабязнасцей жыцця, сексуальных паталогій, дэталёвыя апісанні злачынстваў і г. д.), забываючыся пры гэтым, што "голы паказ праўды" хваравіта закранае маральныя пачуцці большасці чытачоў. "Газеты, часопісы – ад прыватных да абласных і сталічных – заклікаюць моладзь "займацца каханнем", смакуюць падрабязнасці інтымнага жыцця кіназорак і шляхі ўзбагачэння праз прастытуцыю... Няўжо так і павінна быць?"[5] – задае рытарычнае пытанне філосаф С. Лапцёнак, даследуючы ўказаную праблему ў часопісе "Беларуская думка". Публікацыі на "далікатныя" тэмы нярэдка супярэчаць і маральным, і прававым нормам (сексуальны сервіс некаторых газет кваліфікуецца як зводніцтва): ідэя палітычнага плюралізму неправамерна пераносіцца на духоўную сферу. Лічу, што поўная разняволенасць і ўсёдазволенасць пазбаўляе журналіста пачуцця сацыянальнай адказнасці за напісанае.

Духоўнае аздараўленне краіны мяркуе адраджэнне традыцый народа, іх уключэнне ў свядомасць і звычаі людзей, таму надзвычай важным уяўляецца зварот прэсы да гістарычнай, духоўна-маральнай спадчыны нацыі. Аднак побач з пазітыўнымі тэндэнцыямі асвятлення гэтых пытанняў у перыёдыцы выразна прасочваюцца і негатыўныя. Высакародная мэта беларускага нацыянальнага адраджэння, развіцця роднай мовы ў некаторых выданнях даводзіцца да крайнасці, нацыянальнае пытанне паступова пераходзіць у ранг палітычных, адыгрывае ролю казырнай карты ў азартнай "каляўлад-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

най" гульні. Грубыя перахлёсты ў моўнай палітыцы, калі асветніцка-выхаваўчая практыка падмянялася загадна-прымусовымі метадамі выканання Закона аб мовах (1990 г.), вострыя дыскусіі паміж апалагетамі двухмоўя і прыхільнікамі імклівай беларусізацыі (на фоне якіх нярэдка гучаць русафобскія ноты), палеміка аб "няправільнасці" сучаснай беларускай мовы – усё гэта паўплывала на выніку майскага (1995 г.) рэферэндуму: большасць прыняўшых удзел у галасаванні выказалася за наданне рускай мове роўнага статусу з беларускай. Улічваючы ступень зрусіфікаванасці грамадства, цеснае суседства з рускім этнасам, перспектывы беларуска-рускай моўнай роўнасці досыць праблематычныя. Сумленныя публіцысты заклапочана аналізуюць гэтае становішча.

Беларуская публіцыстыка мае глыбокія традыцыі, багатую гісторыю, на працягу якой дасканала адпрацаваны тэхналогіі сутнаснага адлюстравання рэчаіснасці. Сучасная журналістыка зможа адекватна спасцігаць неадназначны характар пераўтварэнняў у жыцці краіны, калі будзе ажыццяўляць глыбокую публіцыстычную рэфлексію паводле сацыяльнай практыкі.

[1] Чичановский А.А. Инстанция истины // Средства массовой информации и жизнь: Возможности, поиск, ответственность. М., 1989. С. 19.

[2] Рощин С.К. Психология и журналистика. М., 1989. С. 108.

[3] Гл.: Расолька С. Знойдзены скарб Напалеона // Звязда. 1997. 2 жн. С. 2.

[4] Алексіевіч С. Паміж узмахамі крыла і рыдлёўкі // Чырв. змена. 1992. 28 верас, 4 кастр. С. 4.

[5] Лаптенок С. И непристойное – пристойно? // Бел. думка 1995. №1. С. 65.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.

To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm